**ВОДЗЫЎ**

на дысертацыю Кітурка Ірыны Фёдараўны

**“Станаўленне і развіццё дзяржаўнай мытнай службы Вялікага Княства Літоўскага (1764–1795 гг.)”,**

прадстаўленай на саісканне вучонай ступені доктара гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя

**Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасці і галіне навукі, па якіх яна прадстаўлена да абароны.**

Змест дысертацыйнага даследавання Кітурка Ірыны Фёдараўны “Станаўленне і развіццё дзяржаўнай мытнай службы Вялікага Княства Літоўскага (1764–1795 гг.)” цалкам адпавядае спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя і галіне навукі – гістарычныя, па якіх яно прадстаўлена да абароны.

**Актуальнасць тэмы дысертацыі** абумоўлена недастатковай ступенню яе асэнсавання ў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі, а таксама высокай ступенню важнасці распрацоўкі для паўнавартаснага даследавання змен, якія адбываліся ў сацыяльна-эканамічным жыцці Беларусі. Вывучэнне працэсу стварэння і развіцця дзяржаўнай мытнай службы, яе месца ў сістэме дзяржаўнага кіравання, вызначэнне асаблівасцей яе дзейнасці ў розныя гістарычныя перыяды з’яўляецца несумненна важным для гістарычнай навукі, для вызначэння характару і зместу сацыяльна-эканамічных і нацыянальна-дзяржаўных працэсаў у гістарычнай рэтраспектве. Акрамя таго, вялікае значэнне гісторыя мытнай службы мае для прадстаўнікоў мытных органаў, паколькі дазваляе больш выразна ацаніць ролю мытнай службы ў фарміраванні і ажыццяўленні эканамічнай палітыкі дзяржавы і спрагназаваць перспектывы развіцця мытнай справы.

Аналіз айчыннай і замежнай гістарыяграфіі, праведзены ў дысертацыі, дае падставу сцвярджаць, што сістэмнага даследавання станаўлення і развіцця дзяржаўнай мытнай службы Вялікага Княства Літоўскага ў 1764–1795 гг. да гэтага часу не было створана.

**Ступень навізны вынікаў, якія атрыманы ў дысертацыі, і навуковых палажэнняў, якія выносяцца на абарону.**

Доктарская дысертацыя Кітурка Ірыны Фёдараўны “Станаўленне і развіццё дзяржаўнай мытнай службы Вялікага Княства Літоўскага (1764–1795 гг.)” з'яўляецца самастойна выкананай навуковай працай, якая мае структурна лагічны змест, вызначае высокі асабісты ўклад аўтара ў навуку і канцэптуальна развівае вельмі актуальны для сучаснай беларускай гістарычнай навукі напрамак даследаванняў, звязаных раскрыццём працэсу станаўлення, развіцця і дзейнасці дзяржаўнай мытнай службы ВКЛ у 1764–

1795 гг. як спецыяльнага інстытута ў сістэме дзяржаўнага кіравання, у цэлым сістэмы дзяржаўнага кіравання і сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў складзе ВКЛ у другой палове XVIII ст.

Дысертацыя з'яўляецца першым у айчыннай і замежнай гістарыяграфіі даследаваннем, у якім вырашана не раскрытая раней праблема станаўлення і развіцця дзяржаўнай мытнай службы ВКЛ у другой палове XVIII ст. Аўтарам вызначана і абгрунтавана роля Скарбавай камісіі ВКЛ у працэсе стварэння і арганізацыі дзейнасці дзяржаўнай мытнай службы, паказана эвалюцыя арганізацыйнай структуры дзяржаўнай мытнай службы ВКЛ, дынаміка зменаў у тэрытарыяльным размяшчэнні пунктаў мытнага кантролю ў ВКЛ на працягу 1764–1795 гг., падрыхтавваны гістарычныя карты, якія істотна дапаўняюць і візуалізуюць характарыстыку прадмета даследавання. Упершыню ў дысертацыі І.Ф. Кітурка высветлены прычыны адмены традыцыі аддавання дзяржаўных мытных пастоў на водкуп або ў арэнду, спынення дзейнасці прыватных мытняў і стварэння дзяржаўнай мытнай службы ВКЛ.

У дысертацыі дадзена характарыстыка ўнутранай арганізацыі дзяржаўнай мытнай службы ВКЛ на працягу другой паловы XVIII ст., вызначаны асноўныя прынцыпы камплектавання штатаў мытных служачых, раскрыта сістэма фінансавага забеспячэння дзейнасці дзяржаўнай мытнай службы ВКЛ, праведзены аналіз развіцця мытнага справаводства, вызначана роля дзяржаўнай мытнай службы ВКЛ у рэалізацыі дзяржаўнай эканамічнай палітыкі ў другой палове XVIII ст. Упершыню паказаны ўдзел мытнай службы у фарміраванні дзяржаўнага бюджэту, раскрыты змест мытнай палітыкі ВКЛ у другой палове XVIII ст., якая забяспечвалася праз дзейнасць мытнай службы па спагнанні мытных пошлін і збораў на падставе мытных тарыфаў, правядзенне мытных працэдур у адпаведнасці з нарматыўна-прававымі актамі, выкананне іншых функцый. Упершыню разгледжана арганізацыя Скарбавай камісіяй ВКЛ сістэматычнага кантролю працы дзяржаўнай мытнай службы, яго ўплыў на ўдасканаленне мытнай справы ў ВКЛ у другой палове XVIII ст.

Дысертацыйнае даследаванне грунтуецца на выкарыстанні і глыбокім аналізе шырокай крыніцазнаўчай базы. Пераважная большасць архіўных крыніц упершыню ўведзена саіскальніцай у навуковае абарачэнне. Аўтарам зроблена высnова, што ў другой палове XVIII ст. у ВКЛ упершыню была створана сістэма мытных пастоў, якая ахоплівала ўсю тэрыторыю краіны незалежна ад формы землеўладання, а дзяржаўная мытная служба ВКЛ была заснавана на якасна новых прынцыпах. На аснове аналізу шырокага кола крыніц І.Ф. Кітурка аргументавана даказала, што мытная служба ВКЛ у другой палове XVIII ст. дзейнічала як самастойны інстытут дзяржаўнага кіравання Вялікага Княства Літоўскага, які меў арганізацыйна-прававыя

асновы функцыянавання, структуру мытных пастоў, штат мытных служачых з адпаведнымі службовымі абавязкамі.

**Абгрунтаванасць і верагоднасць вывадаў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі.**

У дысертацыі І. Ф. Кітурка высновы атрыманы на аснове вывучэння, сістэматызацыі і ўласнага аўтарскага аналізу значнай колькасці крыніц і прац айчынных і замежных гісторыкаў. Высокая ступень абгрунтаванасці і верагоднасці вывадаў і палажэнняў, сфармуляваных у дысертацыі, заснаваны на аналізе, верыфікацыі і сінтэзе вялікай колькасці інфармацыі, пачэрпнутай саіскальніцай з фондаў архіваў і рукапісных аддзелаў бібліятэк Беларусі, Расіі і Літвы, а таксама з апублікаваных крыніц. Спалучэнне значнага эмпірычнага матэрыялу з рэалізаванымі прынцыпамі і метадамі гістарычнага пазнання дазволіла выйсці на аб’ектыўныя высновы, якія носяць канцэптуальны характар. Шэраг фрагментаў даследавання суправаджаецца аўтарскімі табліцамі, змешчанымі ў дадатках, што надае высновам канкрэтнасць і аргументаванасць.

**Навуковая, практычная, эканамічная і сацыяльная значнасць вынікаў дысертацыі з указаннем рэкамендацый па іх выкарыстанні.**

Даследаванне дзейнасці мытнай службы ВКЛ у 1764–1795 гг. менавіта як дзяржаўнага інстытута, заснаванае на выкарыстанні шырокага комплекса гістарычных крыніц і сучасных метадалагічных падыходаў, дазволіць больш глыбока і поўна вывучыць сацыяльна-эканамічную гісторыю Беларусі, гісторыю дзяржаўных служб, а таксама дзяржава- і нацыябудаўнічыя працэсы на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XVIII ст. Тэарэтычная значнасць даследавання заключаецца ў абгрунтаванні аўтарскай канцэпцыі стварэння і развіцця дзяржаўнай мытнай службы ВКЛ у другой палове XVIII ст. як важнага інстытута ў сістэме выканаўчай улады дзяржавы.

Вынікі даследавання знойдуць прымяненне пры падрыхтоўцы абагульняючых навуковых выданняў, вучэбных дапаможнікаў і падручнікаў, пры правядзенні заняткаў па сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі, гісторыі беларукай дзяржаўнасці і гісторыі развіцця мытнай справы ў ВНУ Рэспублікі Беларусь. Тэарэтычныя палажэнні і фактычны матэрыял будуць карыснымі пры падрыхтоўцы дысцыплін спецыялізацыі. Матэрыялы даследавання могуць быць запатрабаваны органамі дзяржаўнага кіравання, мытнага кантролю Рэспублікі Беларусь. Дысертацыйнае даследаванне І.Ф. Кітурка ўжо атрымала шырокае практычнае прымяненне ў вучэбным працэсе, аб чым сведчаць 11 актаў укаранення.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі ў навуковым друку.** Атрыманыя ў працэсе падрыхтоўкі дысертацыі вынікі адлюстраваны ў 36 навуковых працах саіскальніцы, у тым ліку ў манаграфіі “Дзяржаўная мытная

служба Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XVIII стагоддзя (1764–1795 гады)” (Гродна: ГрДУ, 2023) (24 аўт. арк.), 19 артыкулах у выданнях, уключаных у Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў (17,01 аўт. арк.), 16 іншых навуковых публікацыях (5,41 аўт. арк.). Агульны аб’ём апублікаваных работ складае 46,42 аўт. арк.

**Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК.** Афармленне дысертацыі Кітурка І.Ф. поўнасцю адпавядае інструкцыі ВАК Рэспублікі Беларусь. Прысутнічаюць усе неабходныя структурныя часткі; парушэнняў у афармленні дадаткаў і табліц не выяўлена; у дысертацыі ёсць усе неабходныя спасылкі на аўтараў і крыніцы, якія былі выкарыстаны саіскальнікам, а таксама на ўласныя публікацыі, у якіх прадстаўлены асноўныя вынікі дысертацыйнага даследавання. Аўтарэферат дысертацыі цалкам адпавядае зместу работы, раскрывае структуру даследавання, яго асноўныя вынікі.

**Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе**.

Аналіз зместу, узроўню падрыхтоўкі дысертацыйнага даследавання, навізна і грунтоўнасць зробленых у дысертацыі высноў, а таксама апублікаванасць вынікаў работы, іх значная апрабацыя на навуковых канферэнцыях, у вучэбным працэсе шэрагу ўстаноў вышэйшай адукацыі сведчаць аб глыбокім веданні саіскальнікам прадмета і праблематыкі даследавання, высокай навуковай кваліфікацыі І.Ф. Кітурка і адпаведнасці яе вучонай ступені доктара гістарычных навук.

Разам з тым пры ўважлівым азнаямленні з дысертацыяй узніклі **заўвагі і пытанні**, якія патрабуюць дадатковага каментарыя саіскальніцы, тлумачэннія аўтарскай пазіцыі.

- На мой погляд, у дысертацыі для усебаковага раскрыцця даследчыцкіх задач можна было б больш шырока выкарыстаць ускосную гістарыяграфію, навуковую літаратуру па пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця ВКЛ другой паловы XVIII ст., а таксама па гісторыі ўлады і дзяржаўных устаноў;

- Дыскусійнай выглядае ацэнка дзейнасці Скарбавай камісіі ВКЛ, дадзеная ў дысертацыі ў кантэксце, “што стварэнне ў ВКЛ такога дзяржаўнага органа, дзе ўсе рашэнні прымаліся большасцю галасоў, ужо само па сабе сведчыла аб пачатку мадэрнізацыйных працэсаў” (с. 61). На мой погляд, усё ж мадэрнізацыйныя працэсы маюць некалькі іншае вызначэнне і адметныя рысы.

- Хацелася б убачыць на старонках дысертацыі больш разгорнуты разгляд таго, як упісвалася мытная служба ў структуру дзяржаўнай улады і

кіравання ВКЛ другой паловы XVIII ст., якія былі суадносіны яе з іншымі органамі выканаўчай улады.

- У раздзеле 2.3 на с. 74 сцвярджаецца, што “ланцуг мытных пунктаў рознага прызначэння дазваляў наладзіць эфектыўную працу па забеспячэнні мытнага кантролю за перамяшчэннем тавараў і транспартных сродкаў і спагнання ў поўным аб’ёме вызначаных тарыфамі і іншымі дакументамі мытных пошлін і збораў”. Не стаўлю пад сумненне выснову саіскальніцы, аднак на папярэдніх старонках у раздзеле гаворка ідзе больш аб арганізацыйнай структуры дзяржаўнай мытнай службы ВКЛ у другой палове XVIII ст., а не ступені эфектыўнасці яе дзейнасці.

- Саіскальніца ўвяла ў навуковы зварот вялікую колькасць архіўных крыніц, але некалькі здзівіла, на мой погляд, недастаковая ўвага да выкарыстання фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва ў Мінску і ў Гродна. Дысертацыйнае даследаванне толькі б выйграла, калі б больш выразна была дадзена класіфікацыя выкарыстаных у працы крыніц і вызначана ступень іх рэпрзентатыўнасці.

- Можна было б больш разгорнута паказаць высновы ў канцы главы 6 “Дзяржаўны кантроль за дзейнасцю мытнай службы ВКЛ у другой палове XVIII ст.” (с. 209).

Аднак выказаныя заўвагі і пажаданні носяць прыватны характар і не зніжаюць навуковую вартасць праведзенага даследавання.

**Заключэнне.** Дысертацыя Кітурка Ірыны Фёдараўны “Станаўленне і развіццё дзяржаўнай мытнай службы Вялікага Княства Літоўскага (1764–1795 гг.)” уяўляе сабой актуальнае і грунтоўнае даследаванне, якое непасрэдна звязана з распрацоўкай новага напрамку ў айчыннай гістарыяграфіі, утрымлівае новыя, навукова абгрунтаваныя вынікі, якія несумненна маюць высокае тэарэтычнае і практычнае значэнне для далейшага развіцця сучаснай беларускай гістарычнай навукі.

Дысертацыя – самастойна выкананая навуковая праца, якая ў поўнай меры адпавядае патрабаванням, устаноўленых Палажэннем аб прысуджэнні вучоных ступеней і прысваенні вучоных званняў ў Рэспубліцы Беларусь, а Кітурка Ірына Фёдараўна заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені доктара гістарычных навук за:

- распрацоўку аўтарскай канцэпцыі, якая раскрывае станаўленне і развіццё дзяржаўнай мытнай службы ВКЛ у другой палове XVIII ст. як спецыяльнага інстытута ў сістэме дзяржаўнага кіравання, выяўленне ролі Скарбавай камісіі ВКЛ у працэсе стварэння і арганізацыі дзейнасці дзяржаўнай мытнай службы, эвалюцыі яе арганізацыйнай структуры, дынамікі зменаў у тэрытарыяльным размяшчэнні пунктаў мытнага кантролю ў ВКЛ на працягу 1764–1795 гг.;

- вызначэнне прычын стварэння ў другой палове XVIII ст. дзяржаўнай мытнай службы ВКЛ як асобнага інстытута ў сістэме дзяржаўнага кіравання;
- абгрунтаванне этапаў станаўлення і развіцця дзяржаўнай мытнай службы ВКЛ у другой палове XVIII ст., звязаных з істотнымі зменамі ў тэрытарыяльным размяшчэнні мытных пунктаў у ВКЛ, выпрацоўкай новых падыходаў у нарматыўна-прававым і арганізацыйным забеспячэнні дзейнасці мытнай службы (1764–1772 гг.; 1772–1774 гг.; 1775–1791 гг.; 1791–1795 гг.);
- раскрыццё ролі дзяржаўнай мытнай службы ў рэалізацыі эканамічнай палітыкі ВКЛ у другой палове XVIII ст., а таксама зместу мытнай палітыкі ВКЛ у другой палове XVIII ст., якая забяспечвалася праз дзейнасць мытнай службы па спагнанні мытных пошлін і збораў, правядзенне мытных працэдур у адпаведнасці з нарматыўна-прававымі актамі, выкананне іншых функцый;
- вызначэнне ўнутранай арганізацыі дзяржаўнай мытнай службы ВКЛ на працягу другой паловы XVIII ст., асноўных прынцыпаў укамплектавання штатаў мытных служачых, раскрыццё сістэмы фінансавага забеспячэння дзейнасці дзяржаўнай мытнай службы ВКЛ, яе ролі ў рэалізацыі дзяржаўнай эканамічнай палітыкі;
- доказ таго, што мытныя пошліны як плацяжы ад тавараў, якія перамяшчаліся праз мяжу, з’яўляліся галоўным рэгулятарам знешняга гандлю ВКЛ і мелі, як правіла, фіскальную мэту – папаўненне дзяржаўнага бюджэту ВКЛ і скарбу вялікага князя;
- адлюстраванне развіцця мытнага справаводства ў ВКЛ у другой палове XVIII ст., арганізацыі сістэмы дзяржаўнага кантролю за дзейнасцю мытных структур ВКЛ і высвятленне яе значэння для развіцця дзяржаўнай мытнай службы.

Афіцыйны апанент,
доктар гістарычных навук, прафесар,
дэкан гістарычнага факультэта
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта А.Г.Каханоўскі
15 лістапада 2023

ПОДПИСЬ Кахо УДОСТОВЕРЯЮ
Начальник управления организационной работы и документационного обеспечения
Н.В. Черкасская
«15» 11 20 23

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ